# З НАДЫХОДЗЯЧЫМ НОВЫМ 2002-М ГОДАМ!

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ



№ 20 (1013) | ЧАЦВЕР, 27 снежня 2001 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная



## Шаноўныя сябры!

Мы развітваемся з адыходзячым у гісторыю 2001-ым годам, які распачаў новае стагоддзе і трэцяе тысячагоддзе. Для шматтысячнага калектыву нашага універсітэта ён быў пасапраўднаму плённым як у навуковай, вучэбнай, так культурнай і спартыўнай сферах жыццядзейнасці. З прыемнасцю нагадаем найбольш значныя падзеі і факты гэтага года. ГДУ стаў адным з саўдзельнікаў адкрыцця створанага Універсітэта інтэграцыі Саюзнай дзяржавы, што з'явілася важным практычным крокам для забеспячэння адзінай адукацыйнай прасторы, адной з неабходных умоў захавання і развіцця агульных духоўных каштоўнасцей народаў дзвюх славянскіх краін. За падручнік "Педагогіка" доктар педагагічных навук, прафесар, акадэмік НАНБ І.Ф.Харламаў удастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі. За прайшоўшы год выкладчыкамі ГДУ абаронены 3 доктарскія і 16 кандыдацкіх дысертацый. На больш высокі ўзровень узнялася і студэнцкая навука, аб чым сведчаць вынікі рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў на лепшыя даследаванні моладзі. Рубеж сталасці – сваё дзесяцігоддзе ўрачыста адзначыў юрыдычны факультэт. За выдатны ўклад у развіццё вышэйшай адукацыі 3 прафесарам нашага універсітэта ўстаноўлены персанальныя надбаўкі да заработнай платы. Радасная вестка прыйшла ва універсітэт напярэдадні Новага года: фальклорнай лабараторыі філалагічнага факультэта "Вандроўнік" прысуджаны грант прэзідэнцкага Фонду падтрымкі адоранай моладзі, які даў магчымасць для матэрыяльнага стымулявання далейшых навуковых даследаванняў, збору, захавання фальклорнай і культурнай спадчыны Гомельшчыны, удасканалення тэхнічнай базы лабараторыі. Ёсць прыемныя здабыткі і ў нашых спартсменаў: валейбалісты і футбалісты ГДУ сталі чэмпіёнамі рэспублікі сярод студэнцкіх каманд.

З новым годам усе мы звязваем свае лепшыя спадзяванні, надзеі, мары. Няхай яны для Вас абавязкова збудуцца. Моцнага ўсім здароўя, поспехаў у вучобе і працы, дабрабыту, асабістага шчасця!

**РЭКТАРАТ, ПРАФКАМ, ПРАФКАМ СТУДЭНТАЎ.**

## ЗА ВЫДАТНЫ ЎКЛАД У РАЗВІЦЦЁ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Менавіта гэта стала крытэрыем для назначэння штомесячных персанальных надбавак у памеры 30 тарыфных ставак першага разраду прафесарска-выкладчыцкаму складу і навуковым работнікам дзяржаўных вышэйшых навучальных устаноў краіны на 2001/2002 навучальны год. Адпаведнае распараджэнне падпісана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 3 снежня г.г.

Сярод вучоных Гомельшчыны такіх надбавак удастоены 9 чалавек, у тым ліку трое – з нашага універсітэта. Гэта доктары навук, прафесары загадчык кафедры філасофіі У.М. Калмыкоў, Л.М.Сапегін з кафедры батанікі і фізіялогіі раслін, Л.А.Шамяткоў з кафедры алгебры і геаметрыі.

***З высокай адзнакай плённай працы іх горача віншуюць рэктарат, грамадскія арганізацыі, увесь калектыў універсітэта.***

## ЧАКАЕМ ВАС КАЛЯ ЁЛКІ

**30 снежня, у 11** гадзін у фае актавай залы вучэбнага корпуса № 1 пачнецца навагодні ранішнік для дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Дзед Мароз і Снягурачка чакаюць хлопчыкаў і дзяўчынак каля лясной прыгажуні-ёлкі, каб закружыцца ў вясёлым карагодзе, прыняць удзел у цікавых конкурсах, віктарынах, атрымаць прызы і падарункі, убачыць навагоднюю казку ў пастаноўцы работнікаў культурнага цэнтра ГДУ.

ДЗЕД МАРОЗ, СНЯГУРАЧКА.

## НА ПЫТАННІ АДКАЗВАЎ РЭКТАР

Рэдакцыя гарадской газеты "Гомельские ведомости" напярэдадні новага года арганізавала сустрэчу з рэктарам нашага універсітэта прафесарам, старшынёй Савета рэктараў Гомельшчыны, членам Савета Рэспублікі М.В.Селькіным. На працягу дзвюх гадзін ён адказваў на загадзя пастуціўшыя пытанні чытачоў гэтага выдання. Яны закраналі розныя аспекты сённяшняга жыцця і ў першую чаргу праблемы далейшага развіцця агульнаадукацыйнай і вышэйшай школы, удасканалення выхаваўчага працэсу сярод моладзі, перспектыў паляпшэння сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне. Пэўная цікаўнасць была праяўлена да дзейнасці Міхаіла Васільевіча як члена верхняй палаты беларускага парламента, кіраўніка Савета рэктараў Гомельскай вобласці.

Своеасаблівае грамадскае інтэрв'ю з М.В.Селькіным будзе апублікавана ў наступных нумарах "Гомельских ведомостей" і нашай газеты.

## СЛУЖБА АХОВЫ ПРАЦЫ І ТБ ПАВЕДАМЛЯЕ

Для падрыхтоўкі загадаў на 2002 год аб даплатах за работу ў шкодных умовах, бясплатнай выдачы малака на аздараўленне, разліку дадатковых дзён да адпачынку за 2001 год неабходна падраздзяленням прадаставіць службе па ахове працы і ТБ:

— спісы супрацоўнікаў, якія працуюць у шкодных умовах, па ўстаноўленай форме ў 2-х экземплярах;

— спісы супрацоўнікаў на атрыманне бясплатнага малака (1 экз.);

— звесткі аб колькасці адпрацаваных дзён у шкодных умовах за 2001 год памесячна і агульна (улічваюцца толькі тыя дні, у якіх адпрацавана не менш за 80% працоўнага часу ва ўказаных умовах).

Дакументы прадаставіць у тэрмін да 5 студзеня 2002 года (корпус № 3, п.2-11).

## ВІНШУЕМ!

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў матэматычнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры вышэйшай матэматыкі* ***МІРОЦІНА Адольфа Рувімавіча*** *з паспяховай абаронай на спецыялізаваным Савеце Белдзяржуніверсітэта дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.*

❄❄❄

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў гістарычнага факультэта горача віншуюць* ***МЯЗГУ Мікалая Мікалаевіча*** *з кафедры ўсеагульнай гісторыі з прысваеннем яму вучонага звання дацэнт.*

❄❄❄

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў матэматычнага факультэта горача віншуюць* ***РУЖЫЦКУЮ Алену Адольфаўну*** *з кафедры вылічальнай матэматыкі і праграміравання з прысваеннем ёй вучонага звання дацэнт.*

❄❄❄

*Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры алгебры і геаметрыі* ***ШПЫРКО Вольгу Аляксееўну*** *(навуковы кіраўнік – прафесар В.С.Манахаў) з паспяховай абаронай на спецыялізаваным Савеце пры ГДУ дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.*

## НАВАГОДНІ ПАДАРУНАК... НЕ АД ДЗЕДА МАРОЗА

Вялікую партыю вітамінаў агульным коштам 10000 долараў атрымаў нядаўна санаторый-прафілакторый ГДУ. Яны дасланы ў Гомель з Германіі.

Як паведаміў галоўны ўрач студэнцкай здраўніцы А.М.Сабалеўскі, гэтыя прэпараты вельмі карысныя для арганізма чалавека ва ўмовах радыяцыйнага забруджання. Выраблены яны з маслянага экстракту часнаку, іншых каштоўных лекавых раслін, умацоўваюць імунітэт і паслужаць таксама добрым прафілактычным сродкам ад грыпу. Іх добраякаснасць, адпаведнасць тэрмінам захоўвання пацвярджаецца спецыяльным сертыфікатам.

Вітамінаў хопіць на ўсіх студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Яны будуць размеркаваны па факультэтах, структурных падраздзяленнях кожнаму па 200 штук. Гэтай колькасці хопіць для прыёму на некалькі курсаў (па 2 шт. у дзень на працягу месяца з перапынкам у два тыдні).

Гуманітарны груз дасланы таксама фондам "Дзеці Чарнобыля", які ўзначальвае пастар Э.Гюліх з нямецкага г.Нойштадта. Прэпараты жалеза перададзены ў медпункт універсітэта, а пасуда, пасцельная бялізна, мэбля – для патрэб санаторыя-прафілакторыя, універсітэта.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За дасягнутыя поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь узнагароджаны дэкан гістарычнага факультэта, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі **СТАРАВОЙТАЎ Міхаіл Іванавіч**.

За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, вялікі асабісты ўклад у станаўленне і развіццё спецыяльнасці "Правазнаўства" Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны дэкан юрыдычнага факультэта **Ю.А.КЛЮЧНІКАЎ**, дацэнты **І.В.НЯМКЕВІЧ**, **І.І.ЭСМАНТОВІЧ**, старшыя выкладчыкі **Я.К.АЗЁМША**, **С.В.ЖАГОРАЎ**.

За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджаны дацэнт кафедры агульнай фізікі **ШОЛАХ Уладзімір Фёдаравіч**.

## ЮРФАК АДЗНАЧЫЎ ЮБІЛЕЙ

Дзень 7 снежня стаў сапраўдным святам для выкладчыкаў, супрацоўнікаў, студэнтаў і выпускнікоў юрыдычнага факультэта. На ўрачыстай вечарыне, якая праходзіла ў актавай зале, адзначаўся 10-гадовы юбілей спецыяльнасці "Правазнаўства", на базе якой (пасля падзелу гісторыка-юрыдычнага факультэта) быў створаны юрыдычны факультэт.

За прайшоўшы час па стацыянарнай і завочнай формах навучання падрыхтавана каля тысячы спецыялістаў. Яны працуюць пракурорамі, суддзямі, следчымі, натарыусамі, юрысконсультамі на прадпрыемствах розных форм уласнасці, у банках і страхавых кампаніях, падатковых інспекцыях, у прыватных канторах і фірмах па аказанню юрыдычных паслуг, іншых арганізацыях і ўстановах.

У параўнаўча кароткай гісторыі юрфака адметным стала тое, што ўжо прыкметна вырас яго навуковы патэнцыял, значна палепшылася матэрыяльна-тэхнічная база, усё больш гучна заяўляюць аб сабе на навуковых канферэнцыях студэнты. Так пяцікурсніца Вераніка Брылёва адзіная з Беларусі выйшла ў фінал Міжнароднага конкурсу сярод студэнтаў юрыдычных факультэтаў краін СНД на лепшую работу па правах чалавека, дзе ёй было прысуджана другое месца.

З юбілеем і дасягнутымі поспехамі калектыў факультэта горача віншаваў рэктар універсітэта прафесар, заслужаны работнік адукацыі Беларусі, член Савета Рэспублікі М.В.Селькін. Ён жа ўручыў узнагароджаным Ганаровыя граматы ГДУ.

З прывітальнымі словамі і найлепшымі пажаданнямі звярнуліся да юбіляраў пракурор вобласці А.П.Палавінка, старшыня абласнога суда А.А.Федарцоў, начальнік абласнога ўпраўлення юстыцыі аблвыканкама В.У.Макарэвіч.

Пасля ўрачыстай часткі гаспадарамі сцэны сталі самадзейныя артысты, якія парадавалі сваім канцэртам шматлікіх удзельнікаў памятнай вечарыны.

## МЕКСІКА – НОВЫ АДРАС СУПРАЦОЎНІЦТВА

Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны з кожным годам пашырае свае навуковыя сувязі з рознымі краінамі свету. На карце яго супрацоўніцтва ў пачатку новага стагоддзя з'явілася Мексіка. У адпаведнасці з заключаным дагаворам праблемная навукова-даследчая лабараторыя перспектыўных матэрыялаў ГДУ і Навуковы цэнтр кандэнсаванай матэрыі Мексіканскага аўтаномнага універсітэта (г.Енсенада) вядуць сумесныя распрацоўкі ў галіне стварэння і даследавання новых матэрыялаў з унікальнымі оптаэлектроннымі ўласцівасцямі. У мэтах паспяховага вырашэння пастаўленых задач з мексіканскага боку прыцягнуты на кантрактнай аснове для працы ў названым навуковым цэнтры вядомыя вучоныя з Кітая, Індыі, Пакістана, Расіі. Тут жа на працягу двух месяцаў у бягучым навучальным годзе давялося першаму з беларусаў стажыравацца аспіранту фізічнага факультэта ГДУ Дзмітрыю Каваленку, навуковымі кіраўнікамі якога з'яўляюцца ад нашага універсітэта – доктар тэхнічных навук, прафесар І.М.Мельнічэнка, мексіканскага – доктар хімічных навук Н.Я.Багданчыкава.

Нядаўна з Мексікі ад дырэктара Навуковага цэнтра кандэнсаванай матэрыі доктара Леанела Кота Араіза на імя прарэктара па навуковай рабоце ГДУ доктара тэхнічных навук, прафесара Д.Г.Ліна дасланы ліст, у якім выказваецца падзяка яму асабіста і універсітэцкай аспірантуры за плённую працу аспіранта Дзмітрыя Каваленкі. Адзначаецца, што за перыяд стажыроўкі ён грунтоўна вывучыў асаблівасці фарміравання кластэраў серабра і медных агламератаў, падрыхтаваў 89 узораў і зняў больш за 400 аптычных спектраў. Ён жа выступіў з двума дакладамі ў Мексіканскім аўтаномным універсітэце, адправіў вынікі сваіх навуковых даследаванняў у ЗША на пасяджэнне Каліфарнійскага таварыства каталізу, на IV Міжнародную канферэнцыю па матэрыялах для мікраэлектронікі і нанаінжынерыі ў Фінляндыю, на Кангрэс матэрыялаў – 2002 у Лондан.

Аўтар допісу засведчыў таксама вялікую стараннасць і выключную працавітасць Дзмітрыя. За параўнаўча кароткі час ім атрыманы даволі вялікі аб'ём эксперыментальных матэрыялаў, на аснове якіх можна падрыхтаваць некалькі навуковых артыкулаў у міжнародныя часопісы і паспяхова завяршыць напісанне кандыдацкай дысертацыі.

Доктар Леанел Кота Араіз выказаў пажаданне на далейшае супрацоўніцтва з Дзмітрыем Каваленкам, які ў наступным годзе стане выпускніком аспірантуры, і, трэба спадзявацца, з датэрміновай абаронай дысертацыі прыкладнога значэння.

Б.ВАЛОДЗІН.

## 10-ТЫСЯЧНЫ НАВЕДВАЛЬНІК МУЗЕЯ

15 мая 1993 года ў нашым універсітэце гасцінна расчыніў свае дзверы музей-лабараторыя Ф.Скарыны. На яго ўрачыстым адкрыцці прысутнічалі кіраўнікі вобласці і горада, тагачасны пасол Польскай Рэспублікі ў Беларусі Альжбета Смулкава, Мітрапаліт Слуцкі і Мінскі, Патрыярхаў Экзарх усяе Беларусі Філарэт, прадстаўнікі шырокай грамадскасці абласнога цэнтра.



Згаданы музей стаў своеасаблівым цэнтрам па збору і вывучэнню матэрыялаў пра выдатнага дзеяча беларускага народа эпохі Адраджэння, першага ўсходнеславянскага друкара і славутага вучонага. Тут рэгулярна наладжваюцца экскурсіі па прапагандзе культурнай спадчыны вялікага асветніка.

За час існавання музея-лабараторыі тут адбыліся 284 калектыўныя і індывідуальныя экскурсіі. З выставачнай экспазіцыяй азнаёміліся наведвальнікі з многіх краін блізкага і далёкага замежжа. Сярод іх былі кіруючыя работнікі дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, дзеячы навукі, культуры, госці з гарадоў-пабрацімаў і інш.

Самым багатым на наведвальнікаў аказаўся мінулы месяц. У лістападзе супрацоўнікі музея-лабараторыі правялі 19 экскурсій, у якіх удзельнічала 336 чалавек. Асабліва знамянальным стаў для нас дзень 30 лістапада, калі парог музея пераступіў 10-тысячны наведвальнік. Юбілейным экскурсантам аказалася студэнтка першага курса філалагічнага факультэта ГДУ спецыялізацыі "Літаратурная работа ў газетах і часопісах" Святлана Жогла, якая зрабіла памятны запіс (<u>на здымку</u>) у Кнізе ганаровых наведвальнікаў.

**К.УСОВІЧ,**
**загадчык музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**

## ЧАРГОВЫ "ЭКЗАМЕН" СТУДЭНЦКАГА ТЭАТРА

Моцная творчая дружба звязвае гомельскага драматурга, празаіка, кіраўніка абласнога аддзялення Беларускага саюза пісьменнікаў Васіля Ткачова з народным студэнцкім тэатрам-студыяй "Если бы..." Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны. Тры гады таму назад гэты калектыў вылучаўся на прысваенне яму ганаровага звання "народны", і яго рэжысёр Генадзь Варонін ажыццявіў пастаноўку п'есы "Шкірдзюкі займаюць абарону" менавіта названага аўтара. Спектакль атрымаўся, і студэнцкая творчасць была па вартасці ацэнена аўтарытэтнай камісіяй, вельмі цёпла сустрэта гледачамі. Галоўнае, самому драматургу спадабалася ўвасабленне на маладзёжнай сцэне непрафесіянальнымі, самадзейнымі акцёрамі яго аўтарскай задумы. Шчаслівы лёс таго першага спектакля, які прынёс прызнанне універсітэцкаму тэатру, прадвызначыў далейшы творчы шлях калектыву. Калі для яго надышоў час пацвердзіць званне народнага, доўгіх разваг, які твор інсцэніраваць на гэты раз, у рэжысёра не было. Бо В.Ткачоў зноў даверыў яму першаму для пастаноўкі сваю новую п'есу "Нехта ходзіць за акном...".

У адзін са снежаньскіх дзён на сцэне актавай залы ГДУ адбылася прэм'ера спектакля.

... Нешчасліва складваецца лёс галоўнай гераіні п'есы старшакласніцы Алесі. Памірае маці, з якой яны жылі ўдваіх, бо бацька, па яе словах, трагічна загінуў, калі дачка была яшчэ маленькай. Дзяўчына стаіць перад складаным выбарам, што ёй рабіць далей. Дзядзька Антон Антонавіч, які прыехаў на пахаванне маці, настойліва кліча яе пераязджаць у горад да роднай цёткі. Алесі нават цяжка ўявіць сябе без сваёй хаты, гаспадаркі, спраўляцца з якой ёй адной, праўда, цяжкавата, без вернай сяброўкі Кацькі, з якой дзеліць свае дзявочыя надзеі, мары аб сустрэчы ў будучым з каханым, аб нараджэнні дзетак. Але, на жаль, навокал "прынцаў" няма, як ні старайся ўгледзець іх ў вакно. Побач толькі вечна п'яныя суседзі па прозвішчу Шыла і Малдаван, якія просяць пазычыць грошай на бутэльку ці наліць запаветныя сто грамаў, ды бабка Ягорыха, вясковая пляткарка, што ўсюды суе свой цікаўны нос. Але, нягледзячы на гэта здавалася б замкнёнае кола, не ірвецца дзявочая душа ў горад, дзе "тэатры, кіно, марожанае", у кватэру з усімі выгодамі. Яна ўсё роўна тут, дзе яе карані, родны куток, магіла маці, дзе на дапамогу прыйдуць надзейная сяброўка Кацька, малады школьны настаўнік, класны кіраўнік Сямён Цітавіч. Наіўная, даверлівая, як дзіця, якой мы бачым Алесю ў пачатку п'есы, на вачах становіцца дарослай, рашучай, калі Антон Антонавіч адкрывае перад ёй горкую жыццёвую праўду...

Ролі ў спектаклі выконвалі студэнты-акцёры, якія дагэтуль паспрабавалі свае творчыя здольнасці толькі ў невялічкіх сцэнічных мініяцюрах (яны, дарэчы, займаюць адно з галоўных месцаў у рэпертуары тэатра). Але справіліся яны з імі паспяхова, дзякуючы не толькі карпатлівай працы, дапамозе рэжысёра-пастаноўшчыка Г.Вароніна, але і асабістым уражанням, жыццёвым назіранням, атрыманым у час адпачынку на канікулах у вёсцы. Там сустракалі яны такіх жа герояў, як у п'есе: горкіх выпівох, бабак-пляткарак. Можа таму такімі яркімі, каларытнымі, жыццёва праўдзівымі атрымаліся вобразы ў выкананні пяцікурсніцы біяфака Святланы Гандыш (Ягорыха), студэнтаў матэматычнага факультэта Івана Нікалайцава (Шыла), Паўла Раманькова (Малдаван). Цікавай была і роля Кацькі, якую сыграла другакурсніца матфака Надзея Курс. Яна прызналася, што па характары падобная на сваю гераіню, таму зразумець яе ўнутраны свет было няцяжка. Студэнт гэтага ж факультэта Дзяніс Міхайлаў падаўся гледачам у вобразе дзядзькі Антона Антонавіча таксама пераканаўчым. А найбольш складана ўсё ж было Вользе Сухамера, пяцікурсніцы філфака: Алеська — вобраз шматпланавы, неардынарны, і трэба было знайсці тонкія адценні, каб дакладна перадаць душэўны стан сваёй гераіні. І Вольга вельмі старалася гэта зрабіць. Крыху меншай па аб'ёму сцэнічнага часу ў параўнанні з іншымі была роля ў Максіма Крычэўскага (настаўнік Сямён Цітавіч). Можа таму і не паспеў ён поўнасцю "раскрыцца" ў вобразе.



Сем акцёраў тэатра былі непасрэдна заняты ў спектаклі, але ён не адбыўся б без дапамогі астатніх членаў тэатральнага калектыву "Если бы...", якія падрыхтавалі неабходны рэквізіт, касцюмы, дэкарацыі.

Сам драматург В.Ткачоў прысутнічаў на прэм'еры і пасля спектакля выйшаў на сцэну, каб падзякаваць рэжысёру, акцёрам за тое "свята, якое яны яму падаравалі, што ўбачыў на сцэне сваіх герояў менавіта такімі, як задумаў". Ён паставіў аўтографы і падараваў кожнаму з іх сваю новую выдадзеную кнігу — п'есу "Недоразумения". Хто ведае, можа і яе героі з цягам часу ажывуць на універстэцкай сцэне?..

Т.ДУБЯК.

***НА ЗДЫМКУ:*** **акцёры тэатра-студыі "Если бы..." пасля спектакля разам з рэжысёрам Г.Варонінымі драматургам В.Ткачовым.**

**Фота У.Чысціка.**

## ДОБРА ТАМ, ДЗЕ НАС НЯМА?

Наш універсітэт даўно мае трывалыя сувязі з шэрагам вядучых ВНУ блізкага і далёкага замежжа. Супрацоўніцтва з Францыяй у сферы навукі і адукацыі ўжо дало свае вынікі: створаны Франка-Беларускі інстытут кіравання рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне эканомікі. Пэўны час таму назад пачалося наладжванне цесных кантактаў у гэтым жа накірунку і з Польскай дзяржавай. Трэба спадзявацца, што распачатая справа прынясе не менш плёну, стане выніковай і перспектыўнай.

Прыкладам вышэйсказанаму стаў нядаўні прыезд у ГДУ выкладчыцы аднаго з польскіх універсітэтаў г.Кельцэ Малохі Міраславы. Пад час сустрэчы на філфаку яна пазнаёміла прысутных з жыццём польскіх студэнтаў, з прынцыпамі і метадамі іх навучання. Ва універсітэце г.Кельцэ ўжо даволі працяглы час вядзецца паглыбленае вывучэнне рускай мовы. Пры дапамозе высокакваліфікаваных выкладчыкаў студэнты авалодваюць навыкамі маўлення і пісьма, абараняюць курсавыя і магістарскія работы па рускай мове. Шмат з таго, што было пачута нашымі студэнтамі, здалося вельмі знаёмым. Праблемы, звязаныя з недахопам матэрыяльных сродкаў для навучальнага працэсу і навуковай працы, не абмінулі і нашых заходніх суседзяў. Асаблівыя цяжкасці ўзнікаюць у выніку дэфіцыту рускай літаратуры, якая была знята з польскіх кнігарняў пасля правядзення ў пачатку 90-х гадоў рэформы адукацыі. Праўда, польскія студэнты маюць матэрыяльныя перавагі ў параўнанні са сваімі беларускімі калегамі: сярэдняя стыпендыя ў дзяржаўных ВНУ Польшчы складае каля $100.

Належная ўвага ва універсітэце г.Кельцэ надаецца маральна-выхаваўчай рабоце. Паленне цыгарэт на тэрыторыі навучальнай установы забаронена не толькі студэнтам, але і выкладчыкам. За пэўную колькасць пропускаў і непаспяховасць прадугледжваецца выключэнне з універсітэта. Праўда, у гэтым выпадку студэнты маюць магчымасць паўтарыць курс, але з дадатковай аплатай у памеры $500.

Цікава, што залічэнне ва універсітэт г.Кельцэ праводзіцца па сістэме, якая адрозніваецца ад нашай. Польскаму абітурыенту дастаткова проста падаць дакументы ў ліку першых 30-ці (або іншай патрэбнай колькасці) чалавек. Дарэчы, цікавасць да філалагічных дысцыплін у Польшчы не надта вялікая. У той час як у нас найбольш вялікія конкурсы на юрыдычныя і эканамічныя спецыяльнасці, сярод польскіх абітурыентаў найбольшай папулярнасцю карыстаюцца такія грамадскія дысцыпліны як паліталогія і сацыялогія.

**Юлія ЯКАВЕНКА,**
**студэнтка гр. Р-32 філфака.**

## ПАМЯЦІ КАРЫФЕЯ НАВУКІ

У Славянскай бібліятэцы Гомельскага грамадска-культурнага цэнтра адбылася сустрэча з прадстаўнікамі маладзёжных арганізацый, прысвечаная 290-ай гадавіне з дня нараджэння М.В.Ламаносава. Яе арганізатарамі сталі наш універсітэт і Таварыства Кірыла Тураўскага.

Задача Ламаносаўскіх чытанняў заключалася ў тым, каб паказаць неацэнную значнасць Міхаіла Васільевіча як выдатнага вучонага і асветніка на сучасным гістарычным этапе.

Сярод выступіўшых на гэту тэму былі прарэктар ГДУ па навуковай рабоце прафесар Д.Р.Лін, загадчык кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства доктар філалагічных навук У.І.Коваль, загадчык кафедры рускай літаратуры дацэнт Л.Л.Ермакова.

# 2002 ГОД – ГОД ЛОШАДИ



## ПРИХОДИ К НАМ, ТЕТЯ ЛОШАДЬ!

Новое счастье еще в пути, но летит оно к нам уже на полном скаку. Потому что по восточному календарю 2002-й — это год Водяной Лошади! На Востоке рассказывают, что Будда в свой день рождения позвал в гости животных и решил одарить каждое "персональным" годом. Подарки доставались гостям в порядке живой очереди. Лошадь пришла аж седьмой, пропустив вперед медлительную змею. Почему? Да просто из порядочности — какой из змеи путешественник, если у нее даже ног нет? Да, у Лошади есть чувство справедливости. Но не надо думать, будто она великодушна и снисходительна ко всем без разбора. Она трудится, чтобы заработать право на отдых. Так что все труженики в 2002 году вправе ждать заслуженной награды, но вот бездельников и обманщиков Лошадь не переносит. Впрочем, трудоголикам тоже не стоит рассчитывать на ее покровительство и благосклонность — Лошадь любит только тех, кто умеет гармонично сочетать работу и отдых. Год наступает очень активный, так что все свойства Лошади проявятся с особенной силой: работоспособность, независимость, изобретательность, но в то же время и эгоизм, авантюризм и бесцеремонность. Словом, расслабляться не придется.

## КАК ВСТРЕЧАТЬ?

Жизнерадостная оптимистка, Лошадь любит просторы, многолюдные сборища, развлечения. Так что, если в предновогодний вечер или 1 января вы побываете на выставке или в театре, ей это наверняка понравится. Но при всем том она очень привязана к семье, дому, очагу, создавать и сохранять который умеет, как никто другой. Так что не торопитесь покидать родные стены и своих близких в новогоднюю ночь или, по крайней мере, не забудьте непременно позвонить родным и поздравить их. А еще лучше — поднимите тост за свою семью. Главное в эту ночь не количество, а качество: важно, чтобы вас окружали только приятные вам люди (даже на экране телевизора). Еще лучше, если во время встречи Нового года в доме будут животные, им обязательно надо сказать несколько задушевных слов. Еще в наступающий праздник хорошо бы не переедать. По крайней мере, не очень переедать, хотя это и трудно. Разумеется, овес — любимая еда Лошади — не самое удачное блюдо для новогоднего стола, но вот вегетарианский салатик или крупяное печенье будут в самый раз. То же относится и к курятине, хорошей рыбке, дичи. В эту ночь рекомендуется обязательно подать на десерт сыр с фруктами: эта изысканность наверняка придется Лошади по вкусу. А уж если хотите на сто процентов заручиться поддержкой своенравной хозяйки года, положите под елку кусок душистого черного хлеба с солью.

## ЧТО НАДЕТЬ?

Спасибо Лошади — она дает богатые возможности выбора наряда для праздничной ночи. Родная стихия всех лошадей по тому же восточному календарю — огонь и цвет, соответственно, красный. Но наступающий год во власти стихии воды, которую в Китае символизируют черный и синий цвета. Так что выбирайте на свой вкус. Достаточно каких-то выразительных деталей: декоративной заколки, кулона, туфель. Но особенно рекомендуется черный цвет в украшениях: серьги, кулон или ожерелье из агата, обсидиана, черного оникса или мерцающего темного опала. Можно выбрать и любой из других "лошадиных" камней: рубин, гранат, аметист, топаз, гиацинт. Помните, что Лошадь — щеголиха, и значит, где бы и как бы вы ни встречали Новый год — с книжкой на диване или в лесу под елкой, надо соответствовать.

**РОДИВШИЕСЯ в ГОД ЛОШАДИ** люди очень популярны. Обладают веселым характером, умеют обращаться с деньгами. Умны, проницательны, хотя иногда и много говорят. Талантливы, все у них ладится, обращают на себя внимание броской одеждой или непринужденным поведением. Самоуверенны, знают себе цену и неравнодушны (мужчины) к женщинам. Способны забыть обо всем, когда затронуты их чувства. Во всем, что их касается, вкладывают максимум силы и страсти, за исключением служебных обязанностей. Любят развлечения и большие сборища, обожают быть в центре событий. Очень независимы и редко прислушиваются к советам, поступая при этом по собственному усмотрению.

Идеально подходят вам как друзья или спутники жизни — Тигр, Собака, Овца.

Подходят вам более или менее — Дракон, Змея, Обезьяна, Петух, Кабан.

Решительно не подходят вам, абсолютно противопоказаны и даже могут принести вам несчастье — Крыса.

***Год 2002 соответствует году Лошади. Это год честных людей, которые не боятся работы. Год лошади - это год толпы, ведь Лошадь легко может управлять любой толпой, она весела, симпатична и популярна. Год лошади благотворен для тех, кто занимается политикой, спортом и дипломатией.***

Для остальных знаков Новый Год принесет:

### КРЫСА

В этом году вам удастся осуществить лишь те проекты, которые вы заранее продумаете. Если при этом вы не будете проявлять слишком большой интерес к чужой личной жизни, то этот год принесет вам рост богатства и благосостояния. Реально смотрите на жизнь и не тешьте себя иллюзиями. Это год не очень удачный для вас.

### БЫК

Прекратите жаловаться на жизнь, она так к вам благосклонна. Этот год принесет вам денежные прибыли. Проявите упорство и энтузиазм. Опирайтесь на ваш опыт и ничего не бойтесь.

### ТИГР

Не останавливайтесь на достигнутом и всегда стремитесь вперед. Любые начинания приведут к успеху. Этот год пройдет для вас под знаком любви. Вы встретите свою половину, правда сначала вам будет казаться, что вы несовместимы, но первые трудности пройдут и все станет на свои места.

### КРОЛИК

Ваш творческий потенциал достигнет в этом году наибольшего расцвета. Но и деловые начинания не пройдут безуспешно. Ваше материальное положение значительно улучшится. Год идеален для создания семьи. Стабильность отношений должна стать девизом вашей жизни.

### ДРАКОН

Год хорош для людей, занимающих руководящие посты. Однако следует внимательней относиться к окружающим и не заводить новых врагов. Проявите побольше великодушия, не бойтесь проявить доброту и люди потянутся к вам.

### ЗМЕЯ

Этот год выдастся очень бурным, но все неприятности с присущей вам гибкостью удастся обойти. Вы решительны и мудры, не стоит спешить и все придет. В том числе успех в личной жизни.

### ЛОШАДЬ

Активность - это залог вашего успеха. Жизнь в этом году будет всегда повернута лицом. Единственное, что для этого надо сделать, немного усмирить свой пыл и иногда давайте высказаться другим и не будьте агрессивны. Это недобрый год для вас, а для огненной лошади он может оказаться трагичным

### КОЗА

Этот год позволит вам реализовать самые смелые желания. Больших успехов добьются люди, работающие в сфере науки, дизайна и СМИ. Главное, проявить терпение в ожидании результатов. В личной жизни вас ждут коренные и неожиданные перемены.

### ОБЕЗЬЯНА

В этом году вам предстоит решить сложные проблемы, но вы с честью выйдете из положения благодаря быстрому мышлению, оптимизму и разуму. Возможно вам придется схитрить, но это поможет вам добиться цели. Много внимания придется уделить детям.

### ПЕТУХ

В начале года вам будет казаться, что окружающие вас не понимают, однако это впечатление обманчиво. С вами всегда есть ваши друзья. Они помогут вам справиться с неприятностями и вторая половина года пройдет под лозунгом понимания и счастья.

### СОБАКА

Поменьше пессимизма и побольше надежд! В этом году все усилия, которые вы вложите в реализацию деловых проектов, принесут прибыль. Хорошей опорой для вас будет семья и любимый человек.

### КАБАН

Не позволяйте окружающим пользоваться вашей простотой и загонять вас на вторые роли. В этом году судьба будет благосклонна к вашим рискованным начинаниям. Смело идите вперед и старайтесь поменьше оглядываться назад. В личной жизни наступит гармония

## Анекдоты

– Этот Дед Мороз все перепутал, – сказал призывник.

– А в чем дело? – спросил его товарищ.

– Пятнадцать лет назад перед Новым годом я просил его подарить мне военную форму. И вот только теперь я ее получил.

*****

Сын – отцу:

– Папочка, а почему ты так высоко конфеты на елочку повесил?

– А это чтобы ты, малыш, их до Нового года не скушал.

– Так что же мне теперь, папочка, серпантин жевать?

*****

В самолете пассажир смотрит в иллюминатор и в испуге подзывает к себе стюардессу:

– Мы что, сбились с курса?

– Нет, с чего вы это взяли?

– Но под нами снег, тайга, а должны быть Гавайи...

– Да нет, всё нормально, просто это новые русские Новый год празднуют...

*****

Решили студенты Новый год праздновать в заброшенном замке с привидениями. Одна девушка отказывается:

– Мне мама не разрешает встречать Новый год с привидениями.

– Почему?

– У них на работе одна женщина встречала Новый год с привидением, так теперь не может в детский сад ребёнка устроить!

*****

Два бомжа после новогоднего праздника обмениваются впечатлениями:

– Новый год отлично встретил! Выхожу из подвала, смотрю, на лестничной площадке бутылка из-под водки – грамм 100 недопито, в бачок заглянул – бутерброд с икрой, только раз надкушено. Выпил, закусил, по улице погулял. А ты как?

– Плохо, весь праздник дома просидел: какой-то гад каток на люк поставил.

*****

– А давайте позовем тех, без кого не обходится ни один Новый год?

– Давайте… – Милиция! Милиция!

## НОВОГОДНИЕ ТОСТЫ

Однажды шли три странника. В пути их застала ночь. Они увидели дом, постучали. Им открыл хозяин и спросил:

– Кто вы?

– Здоровье, Любовь и Богатство. Впустите нас переночевать.

– Жаль, но у нас только одно свободное место. Пойду, посоветуюсь с семьей, кого из вас впустить. Больная мать сказала: "Давайте впустим Здоровье". Дочь предложила впустить Любовь, а жена – Богатство. Пока они спорили, странники исчезли. Так выпьем за то, чтобы в новом году в нашем доме всегда было место для Здоровья, Любви и Богатства!

*****

Давайте выпьем за Деда Мороза и Снегурочку: никогда не болеют, не стареют и деньги на подарки всегда есть! За то, чтобы мы тоже были такими!

*****

*Желаем Вам, чтоб Дед Мороз*
*Мешок здоровья Вам принес!*
*Веселья каждому раздал,*
*Поднес шампанского бокал,*
*Забрал в мешок недуг, тоску,*
*И спрятал где-нибудь в лесу!*

*****

*За Новый год поднимем тост,*
*Пусть будет тост предельно прост,*
*За счастье, дружбу, смех,*
*Во всех делах большой успех,*
*За чуткость, нежность, доброту,*
*Семейной жизни теплоту.*

## ФРАЗЫ ОТ ДЕДА МОРОЗА

*Мы уже не празднуем Новый год — мы празднуем, что выжили в старом.*

* * *

*Новый год — это праздник, который длится от ужина до завтрака.*



**Пусть мчит к новым творческим победам участников народного фольклорно-хореографического коллектива ГГУ «Радимичи» эта симпатичная лошадка, которая стала ее полноправным «артистом».**

**Фото В.ЧИСТИКА.**

# З ЧУЛЫМ СЭРЦАМ І ДОБРАЙ ДУШОЙ

Аб ролі і месцы прадстаўніц слабага полу ў сучасным грамадстве вялі зацікаўленую размову дэлегаткі праходзіўшай нядаўна III Гомельскай абласной канферэнцыі жанчын.

На сённяшні дзень на Гомельшчыне ў працоўных калектывах прадпрыемстваў, устаноў, калгасаў, саўгасаў, розных таварыстваў дзейнічае звыш 400 пярвічных жаночых арганізацый. Яны абараняюць інтарэсы сям'і, жанчын, дзяцей, імкнуцца забяспечваць ім нармальныя ўмовы жыцця, працы. Аб гэтым гаварыла ў справаздачным дакладзе старшыня абласнога Савета жанчын В.М.Кашавенка. Сваім вопытам работы дзяліліся на канферэнцыі многія кіраўнікі жансаветаў розных арганізацый вобласці.

Ад нашай ВНУ дэлегатамі канферэнцыі з'яўляліся старшыня Савета жанчын ГДУ дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Т.І.Язэпава і аўтар гэтых радкоў. Тамара Ігнатаўна падрабязна расказала на канферэнцыі аб той рабоце, якая вядзецца ва універсітэце па наладжванню нармальных умоў працы, стварэнню добрага мікраклімату ў калектыве, захаванню правоў жанчын і вырашэнню іх надзённых праблем. Падкрэслівалася, што жансавет універсітэта працуе ў цесным кантакце з рэктаратам, прафкамамі, якія заўсёды з гатоўнасцю аказваюць неабходную дапамогу ў яго дзейнасці.

Удзельніцы канферэнцыі вызначылі першачарговыя задачы, над якімі трэба працаваць: аказваць паўсядзённую ўвагу шматдзетным і маламаёмным сем'ям, стварыць спецыяльны фонд ахвяраванняў для маламаёмных грамадзян, займацца працаўладкаваннем жанчын, ствараючы для іх новыя рабочыя месцы, актывізаваць свае намаганні ў сферы кіравання справамі грамадства і дзяржавы. Менавіта жанчыне, якая дае жыццё, адводзіцца асаблівая роля і ў духоўна-маральным аздараўленні сённяшняга грамадства, прапагандзе здаровага ладу жыцця.

У вырашэнні пастаўленых задач ёй дапамогуць не толькі разважлівасць, розум, але чулае сэрца і добрая душа.

На канферэнцыі на новы тэрмін старшынёй абласнога Савета жанчын аднагалосна зноў абрана В.М.Кашавенка. Т.І.Язэпава выбрана ў праўленне абласной жаночай арганізацыі.

Т.ДУБЯК.

# ЦІКАВЫЯ СУСТРЭЧЫ НА ФІЛФАКУ

Наш універсітэт прымаў прадстаўнікоў БДУ, у прыватнасці, выкладчыкаў кафедры рускага і агульнаславянскага мовазнаўства. У студэнтаў-першакурснікаў філфака была магчымасць пагутарыць з А.Я.Долбік, якая добра вядома абітурыентам як аўтар вучэбных дапаможнікаў для падрыхтоўкі паступаючых у ВНУ. Госця расказала пра некаторыя наваўводзіны ў Белдзяржуніверсітэце. Так, напрыклад, яго студэнты нядаўна перайшлі на новую сістэму навучання: чатыры гады яны будуць займацца па звычайнай (аналагічнай) праграме, затым — бакалаўрыят (адзін год), а для самых таленавітых — магістратура. Таксама першакурснікі даведаліся аб новых галінах у сферах мовазнаўства, напрыклад, камп'ютэрнай лінгвістыцы. Распавядаючы студэнтам аб культурным жыцці БДУ, А.Я.Долбік не забылася і пра галоўны яго гонар — каманду КВЗ, якая радуе балельшчыкаў сваёй гульнёй.

Яўгенія ГРАЧАНІКАВА,
студэнтка гр.Р-11.

Першакурснікі сустрэліся з дацэнтам Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Я.Купалы М.А.Даніловічам і супрацоўніцай Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы НАН Беларусі дактарантам Т.У.Валодзінай. Першы госць пазнаёміў з жыццём свайго універсітэта, адзначыў, што сёння студэнцкая моладзь шмат увагі надае вывучэнню вуснай народнай творчасці Гродзеншчыны, наладжвае трывалыя сувязі з Польшчай, ажыццяўляе абмен вопытам ВНУ Беларусі і іншых краін. Т.У.Валодзіна, чалавек самаадданa захоплены сваёй справай, з вялікім натхненнем распавядала пра Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, у якім вядзецца няспынная навуковая праца па зборы і вывучэнні фальклорных матэрыялаў, гісторыі, побыту, культуры беларусаў, што ў значнай ступені спрыяе ўзмацненню сувязей маладога пакалення з мінуўшчынай.

Ірына СОЙКА,
студэнтка гр.БА-13.

# СІДАРАЎ Аляксандр Уладзіміравіч



Усе мы добра ўсведамляем: лёс, жыццё чалавека — непрадказальныя. І ўсё ж не хочацца змірыцца з думкай, паверыць, што сярод нас ужо няма Аляксандра Уладзіміравіча Сідарава. Вестка аб яго смерці была зусім нечаканай, балюча кранула нашы сэрцы. На выгляд моцнага складу, вытрыманы ў паводзінах, сціплы і дабрадушны па характару, неяк па-асабліваму ён вызначаўся сярод сваіх калег. Яму было крыху больш за 45, ён знаходзіўся ў росквіце сіл, на грэбені сваёй навукова-педагагічнай дзейнасці. І раптам назаўжды мы развіталіся з ім. Словамі цяжка перадаць гэту страту.

Аляксандр Уладзіміравіч нарадзіўся ў Гомелі ў сям'і педагогаў. Яго бацька, былы франтавік, Уладзімір Сцяпанавіч доўгі час загадваў кафедрай філасофіі нашага універсітэта, працаваў яе дацэнтам. Ён ганарыўся сваім сынам, які паспяхова закончыў матэматычны факультэт, аспірантуру, абараніў дысертацыю, стаў кандыдатам фізіка-матэматычных навук, дацэнтам кафедры алгебры і геаметрыі.

Самыя лепшыя ўспаміны аб Аляксандру Уладзіміравічу надоўга захаваюцца ва ўсіх яго калег, былых аднакласнікаў і аднакурснікаў, кожнага з ранейшых і цяперашніх студэнтаў універсітэта, каму ён шчодра перадаваў свае веды.

ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.

СНІДу – стоп!

# ВЫБАР — ЗА КОЖНЫМ

Конкурс плакатаў і насценнага друку, што праходзіў у нашым універсітэце ў рамках Сусветнага дня прафілактыкі СНІДу пад дэвізам "Мне не ўсё роўна, а табе?", яскрава засведчыў: студэнцкая моладзь добра ўсведамляе, якую вялікую пагрозу ўяўляе сабой захворванне веку, што неабходна супрацьстаяць яго распаўсюджванню ўсімі магчымымі сродкамі. Іх разуменне праблемы СНІДу, занепакоенасць лёсам сённяшняга, а таксама наступных пакаленняў прысутнічала ў прадстаўленай на выстаўцы творчасці — ад тэматычных малюнкаў, плакатаў, калажаў да шчырых споведзяў, вершаваных радкоў, напоўненых трывогай і болем.

Па ўмовах конкурсу пераможцы вызначаліся асобна сярод факультэтаў і інтэрнатаў ГДУ. Неабходна адзначыць вялікую актыўнасць студэнтаў, якія ў ім удзельнічалі. Так, будучыя матэматыкі пастараліся менавіта да конкурсу аднавіць выпуск факультэцкай газеты "Беспредел", якая пэўны час не выдавалася (члены яе рэдкалегіі закончылі ГДУ). У гэты першы нумар увайшлі матэрыялы на зададзеную тэму, і яна была шматбакова раскрыта ў газетных публікацыях.

Цікава і арыгінальна падышлі да выканання задання студэнты геолага-геаграфічнага факультэта. Папярэджаннем, перасцярогай ад спакусы сучаснай моладзі перад мімалётным захапленнем стала іх серыя малюнкаў "Гісторыя кахання ў дарожных знаках".

Свае паэтычныя здольнасці змаглі паказаць студэнты-філолагі, якія ў пранікнёных вершаваных радках выказалі сваё стаўленне да праблемы СНІДу.

Студэнты факультэта фізічнай культуры, якім па спецыфіцы сваёй будучай прафесіі належыць клапаціцца аб здаровым ладзе жыцця людзей, таксама вельмі сур'ёзна падрыхтаваліся да конкурсу: іх калаж атрымаўся вельмі ўдалым.

Па-філасофску заглыбленымі, вобразнымі былі маляўнічыя плакаты будучых фізікаў. Адзін з іх настолькі ўзрушыў кагосьці з наведвальнікаў выставы, што ён нават выказаў жаданне купіць яго для сябе.





Вельмі ўразілі, нікога не пакінулі раўнадушнымі экспазіцыі, аформленыя жыхарамі інтэрната № 1, студэнтамі юрыдычнага факультэта, факультэта замежных моў. Самі назвы плакатаў "Дарога ў пекла", "Не разбівай сваё сэрца" гучалі як строгі напамін юнакам і дзяўчатам быць больш адказнымі ў сваіх паводзінах, каб засцерагчы ад бяды і сябе, і сваіх каханых.

Па-свойму вобразна адлюстравалі балючую тэму і ўсе астатнія ўдзельнікі конкурсу. Членам журы на чале з прарэктарам па выхаваўчай рабоце А.В.Лысяковым нялёгка было адразу вызначыць лепшых. На іх думку, студэнтам юрыдычнага факультэта найбольш поўна, удала, шматгранна ўдалося справіцца з пастаўленай задачай, таму ім і было аддадзена першае месца. На другім — факультэт замежных моў, трэцім — факультэт фізічнай культуры. Пальма першынства ў сваёй падгрупе аддадзена жыхарам інтэрната № 1, наступныя прызавыя месцы — у інтэрнатаў № 4 і № 2.

Пераможцы атрымалі дыпломы, вельмі каштоўныя прызы: музычны цэнтр, відэамагнітафон, электрачайнікі, тэлефонныя апараты.

Т.НІКАЛАЕВА.

ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— беларускай культуры — асістэнта;

— беларускай мовы — асістэнта;

— эканамічнай інфарматыкі і АСК — загадчыка кафедры;

— оптыкі — дацэнта.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

РЭКТАРАТ.

СПОРТ

# ПАПАЎНЕННЕ МАЙСТРОЎ СПОРТУ

На чэмпіянаце Беларусі па паўэрліфтынгу (жым штангі лежачы), у якім прынялі ўдзел зборныя абласцей і г.Мінска, зборная Гомельшчыны паднялася на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару.

Важкі ўклад у агульнакамандную скарбонку ўнеслі выхаванцы майстра спорту Уладзіміра Галавача: чацвёртакурснік факультэта фізічнай культуры майстар спорту Павел Чакмароў не толькі пераможца ў вагавай катэгорыі да 56 кг, але і ўстанавіў новы рэкорд Беларусі – 123,5 кг. Выпускнік ГДУ майстар спорту міжнароднага класа Уладзімір Гадуноў стаў пераможцам у вагавай катэгорыі да 67,5 кг.

Трэцякурснік эканамічнага факультэта Максім Пятроўскі (52 кг) стаў сярэбраным прызёрам чэмпіянату, выканаўшы нарматыў кандыдата ў майстры спорту РБ. Пяцікурснік гістарычнага факультэта Андрэй Кашыцкі (100 кг) упершыню выканаў нарматыў на прысваенне звання "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь".

# РАСЦЕ КАЛЕКЦЫЯ ЎЗНАГАРОД

У спартыўным комплексе "Гомсельмаш" прайшоў розыгрыш адкрытага Кубка Гомеля па паўэрліфтынгу, дзе за ўзнагароды спрэчку вялі дзевяць каманд.

Па-за канкурэнцыяй на спаборніцтвах былі выхаванцы двухразовага чэмпіёна Еўропы Уладзіміра Галавача, якія папоўнілі калекцыю спартыўных узнагарод, заваяваўшы Кубак.

Каманда-пераможца набрала 197 ачкоў, на другім месцы гаспадары памоста – 144 ачкі і на трэцім – навабеліцкія асілкі – 143.

Прыемна адзначыць, што пяць студэнтаў нашага універсітэта падняліся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару. Вось іх імёны: Міхаіл Антропаў (60 кг), Мікалай Жукоўскі (90), Аляксандр Пабягаеў (100), Пётр Клімкоў (125) – усе студэнты факультэта фізічнай культуры і Андрэй Кашыцкі (110 кг) – пяцікурснік гістарычнага факультэта.

В.МАРЧАНКА.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра алгебры і геаметрыі, увесь калектыў матэматычнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці кандыдата фізіка-матэматычных навук, дацэнта **СІДАРАВА Аляксандра Уладзіміравіча** і выказваюць сваё спачуванне яго сям'і і родным.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Песіна, 80, пакой 2-14. Тэл. 56-30-71. E-mail: rggu@gsu.unibel.by

Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Спонсар газеты — прафкам студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар Уладзімір БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 726
Падпісана да друку 21.12.2001 г.